## Прашу слова

# ШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ ПАТРАБУЕЦЦА «РЭВІЗІЯ»

**Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што да праблем адукацыі ўсе мы маем дачыненне — прамое ці апасродкаванае. Для Беларусі, якая не валодае багатымі прыроднымі рэсурсамі, адукацыя набывае асабліва важную ролю. Невыпадкова ў апошні час на дзяржаўным узроўні прымаюцца рашэнні, якія так ці інакш датычацца адукацыйнай сферы. Асноватворнымі пытаннямі, на маю думку, заўсёды былі і будуць наступныя: «Чаму вучыць?», «Як вучыць?», «Каго вучыць?» і «Хто будзе вучыць?».**

Калі раней галоўным было навучыць чытаць, пісаць і лічыць, дык сёння акцэнты змяшчаюцца ў бок умення самастойна здабываць інфармацыю (а не назапашваць яе і запамінаць), развіцця крытычнага мыслення, творчага падыходу да справы, здольнасцяў да ўзаемадзеяння. У гэтай сувязі вельмі важна вызначыць тыя прадметы і распрацаваць вучэбныя планы, якія будуць спрыяць усебаковаму развіццю вучняў і падрыхтуюць іх да далейшага навучання і практычнай дзейнасці. ЮНЕСКА аднесла да пяці найважнейшых дысцыплін геаграфію, гісторыю, замежную мову, псіхалогію і філасофію. Як бачым, некаторыя з гэтых прадметаў у нашых школах увогуле не прадстаўлены. Перакананы, што прыйшоў час правесці сур'ёзную рэвізію школьных дысцыплін, якая павінна абавязкова закрануць і колькасць гадзін на вывучэнне тых ці іншых прадметаў. З вышыні пражытых гадоў магу з упэўненасцю сцвярджаць, што рэальна за ўсё сваё жыццё з многімі аспектамі некаторых прадметаў (напрыклад, матэматыкі, хіміі) сутыкацца даводзілася вельмі рэдка. І не толькі мне аднаму. А вось з тым, што выпускнік сярэдняй школы не можа свабодна размаўляць па-беларуску, сустракаюся даволі часта.

Амаль сто гадоў таму Аркадзь Смоліч адзначаў, што *«асноваю нацыянальнай школы служыць родная мова...»*. Вось ужо больш за чвэрць стагоддзя Рэспубліка Беларусь з'яўляецца незалежнай краінай, а нічога іншага, акрамя здзіўлення, не выклікаюць сённяшнія лічбы навучання па-беларуску вучняў агульнаадукацыйных школ (13 працэнтаў ад агульнай колькасці) і студэнтаў ВНУ (1 працэнт).

Бадай, самае складанае з усіх асноватворных пытанняў адукацыі — «Як вучыць?». Змена прыярытэтаў у адукацыйным працэсе не можа не паўплываць на змяненне методык навучання, ролю і месца настаўніка ў вучэбным працэсе, асэнсаванне ведаў. Быць проста перадатчыкам ведаў — гэта ўжо ўчарашні дзень. Сёння педагог павінен найперш выступаць арганізатарам працэсу самаадукацыі вучняў, асабліва ў старшых класах. На змену маналогу павінен прыйсці дыялог, а індывідуальная дзейнасць вучняў — спалучацца з каманднай дзейнасцю (класа ці групы). Важна навучыць вучыцца і творча падыходзіць да справы, а не трансляваць пачутае...

Ні ў якім разе нельга забывацца пра тое, што новае пакаленне, якое ўступае ў жыццё, па-іншаму не толькі думае, але і ўспрымае інфармацыю. Калі раней веданне цікавых фактаў з'яўлялася пэўным дасягненнем, то сёння, дзякуючы інтэрнэту, любыя факты становяцца агульнадаступнымі ўсім ахвотным за лічаныя секунды. Таму асноўны акцэнт у навучанні павінен рабіцца на ацэньванні інфармацыі, на яе тлумачэнні, крытычным аналізе, а не на фіксацыі.

Зразумела, што новыя падыходы да методыкі навучання патрабуюць кардынальных змяненняў у падрыхтоўцы падручнікаў. Магу з упэўненасцю сцвярджаць, што якасны падручнік, складзены пісьменна, даступна і цікава, — амаль гарантаваны поспех удалага засваення прадмета. Упэўнены, што конкурс на іх напісанне павінен быць арганізаваны не так, як ён выглядае цяпер: закрытая сістэма падвядзення вынікаў, калі ўдзельнікі не могуць бачыць работы сваіх канкурэнтаў, падбор выпадковых рэцэнзентаў і г. д. Перакананы ў тым, што галоўным экспертам школьнай вучэбнай літаратуры павінен быць настаўнік. Пры сённяшніх тэхнічных магчымасцях арганізаваць такі конкурс і падвядзенне яго вынікаў не складае ніякіх цяжкасцяў.

Мяркую, што прыйшоў час, каб дазволіць самім настаўнікам выбіраць падручнікі па сваіх прадметах. Галоўнае, каб яны адпавядалі вучэбнай праграме і было з чаго выбіраць. Каб зацікавіць навукоўцаў і настаўнікаў у іх стварэнні, Мінадукацыі трэба распрацаваць сістэму грантаў і стымуляваць гэты працэс. Паколькі напісанне якаснага падручніка — справа складаная, наіўна думаць, што з'явіцца шмат ахвотных.



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Што датычыцца самога зместу падручнікаў, тут прыярытэт павінен быць на карысць прыкладных аспектаў, ці, інакш кажучы, практычнага значэння. Не сакрэт, што дзейныя вучэбныя праграмы па большасці школьных прадметаў і шэрагу дысцыплін ВНУ маюць дысбаланс на карысць пазнавальнасці. Заўважу пры гэтым, што ад правільна выбраных суадносін паміж пазнавальнасцю і прыкладным характарам падачы матэрыялу будуць залежаць і гадзіны на іх вывучэнне на розных дысцыплінах і ў розных класах. І самае галоўнае, гэтыя суадносіны будуць непасрэдна ўплываць на разуменне важнасці прадмета з боку навучэнцаў, без чаго адукацыйны працэс у сённяшніх умовах нельга ўявіць. Праблема матывацыі ў навучанні, асабістай зацікаўленасці застаецца па-ранейшаму ў айчыннай адукацыі вельмі вострай.

Разважаючы над пытаннем «Каго вучыць?», важна найперш зыходзіць з таго, што сённяшні вучань (тым больш студэнт) — гэта ўжо не ўчарашні школяр (батанік), якому хацелася больш ведаць. Калі раней і цікавіла вучняў пытанне «Чаму?», дык цяпер усё часцей ад іх можна пачуць «Навошта?». Трэба прызнаць, што той здаровай цікаўнасці, якая мела месца зусім нядаўна, ужо амаль няма, замест яе з'явіліся практыцызм і меркантыльнасць («А што я буду з гэтага мець?»).

І, нарэшце, пытанне «Хто будзе вучыць?». Калі ўзгадаць, якія нізкія конкурсы былі пры паступленні абітурыентаў у педагагічныя навучальныя ўстановы краіны ў апошнія гады, то аптымізм міжволі знікае. Адказ на пытанне, ці зможа «запаліць» вучня, дапамагчы яму раскрыць свой патэнцыял настаўнік, якога самога не «запалілі» ў свой час, застаецца відавочным....

Па-за пастаўленымі ў пачатку артыкула пытаннямі засталося яшчэ адно, абысці якое лічу няправільным: як спалучаецца атрыманне ведаў у школе з выхаваннем? Думаю, гэтыя два працэсы непадзельныя, хоць прыярытэт, безумоўна, павінен заставацца за ведамі. Галоўным у выхаванні, на маю думку, павінна быць не колькасць мерапрыемстваў, а ўздзеянне на вучняў праз асабісты прыклад педагога. Калі зыходзіць з таго, што жыццё настаўніка, асабліва сельскага, адбываецца ва ўсіх на вачах, нельга не разумець, якім можа быць яго ўплыў на паводзіны, характар і стаўленне да справы яго падапечных. Яшчэ адзін важны аспект выхавання звязаны з арганізацыяй вандровак па краіне. З-за вялікай бюракратызацыі гэтага працэсу, на жаль, нярэдка многія вучні перыферыйных школ могуць ні разу за гады навучання не пабачыць не толькі сталіцу сваёй краіны, але і абласныя цэнтры.

Па вядомых прычынах асноўнае месца ў маіх разважаннях занялі праблемы агульнай сярэдняй школы, бо менавіта яна з'яўляецца падмуркам для далейшага навучання праз усё жыццё. Хоць упэўнены, што і ў вышэйшай школе іх не менш. Яны асабліва востра паўстануць у сувязі з магчымым пераходам ВНУ на трохгадовы тэрмін навучання. За тры гады можна атрымаць асновы ведаў і авалодаць практычнымі навыкамі па многіх спецыяльнасцях, аднак вышэйшая адукацыя не павінна зводзіцца толькі да прыкладных момантаў... Яна развівае кругагляд чалавека, вучыць глядзець на праблемы не толькі шырэй, але і значна глыбей, узнімае чалавека на больш высокі культурны ўзровень. Не сакрэт, што цяперашнія выпускнікі ВНУ па сваім інтэлектуальным развіцці саступаюць тым, хто вучыўся ў ХХ стагоддзі. Таму калі ўжо пачынаць займацца праблемамі адукацыі, дык адначасова трэба вырашаць іх як у сярэдняй, так і ў вышэйшай школе, паколькі сувязь паміж імі — непасрэдная.

**Вячаслаў САСНОЎСКІ,**
**кандыдат геаграфічных навук,**
**дацэнт**

■

## Вышэйшая школа

# МЭТА — ТРАПІЦЬ У 1 % НАЙЛЕПШЫХ ВНУ Ў СВЕЦЕ

**На прафесарскім сходзе агучылі стратэгічныя мэты развіцця БДУ. Удзел у ім прынялі больш як 350 дактароў навук і прафесараў універсітэта.**

Як адзначыў рэктар БДУ Андрэй Кароль, у аснову стратэгіі пакладзены вынікі праведзенага сістэмнага аналізу дзейнасці ўніверсітэта.

Ключавымі для ўстойлівага і дынамічнага развіцця комплексу БДУ з'яўляюцца наступныя мэты: павышэнне якасці адукацыі, выбудоўванне кадравай палітыкі з апорай на рэальныя дасягненні ўсіх катэгорый супрацоўнікаў, павелічэнне колькасці прафесарска-выкладчыцкага складу з вучонымі ступенямі, стварэнне цэласнай сістэмы эфектыўнага ўкаранення вынікаў навуковых даследаванняў, уваходжанне ў лік 300 найлепшых універсітэтаў свету (1 працэнт), павелічэнне экспарту адукацыйных паслуг і пазабюджэтных даходаў комплексу БДУ, удасканаленне фінансава-гаспадарчай дзейнасці. Па словах рэктара, кожная з мэт мае канкрэтныя паказчыкі вымярэння.

Сістэмная работа па рэалізацыі пастаўленых задач ужо распачалася. Так, у БДУ распрацаваны і рэалізуецца праект Стратэгіі развіцця кадравага патэнцыялу. Напрыклад, на 20 працэнтаў абноўлены склад загадчыкаў кафедраў, сярэдні ўзрост якіх складае цяпер 44 гады, скарочана 20 ставак кіруючых работнікаў комплексу БДУ. За кошт аб'яднання Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій і Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій (ДІКСТ) БДУ праведзена аптымізацыя спецыяльнасцяў эканамічнага і гуманітарнага профіляў, а таксама рэструктурызаваны Інстытут журналістыкі. Рэалізуецца механізм рэйтынгавай сістэмы аплаты працы ўсіх катэгорый супрацоўнікаў універсітэта. Таксама ў БДУ ўкаранёна новая форма ўзаемадзеяння факультэтаў і інстытутаў з кіраўніцтвам БДУ, паляпшаецца матэрыяльна-тэхнічная база карпусоў і грамадскага харчавання і інш. Зараз на парадку дня стаіць капітальны рамонт галоўнага корпуса БДУ па праспекце Незалежнасці

■

## Масты сяброўства

# БДПУ ЧАКАЕ ГАСЦЕЙ

**IV Міжнародны адукацыйны праект «Летняя школа — 2018. Пазнай Беларусь: ад адукацыі да культуры» стартуе ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце 28 чэрвеня.**

Чакаецца, што яго ўдзельнікамі стануць студэнты з Арменіі, Беларусі, Кітая, Туркменістана і Чэхіі. На працягу дзесяці дзён яны будуць навучацца ў выкладчыкаў БДПУ беларускай мове і беларускай народнай творчасці. Даведаюцца пра вышэйшую адукацыю ў Беларусі, умовы навучання ў магістратуры, аспірантуры і дактарантуры БДПУ, аб рабоце студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый універсітэта. Разам са студэнтамі педагагічнага ўніверсітэта яны прымуць удзел у праекце «Дзеці сталіцы», далучацца да педагагічных атрадаў.

Гасцей чакае і цікавая культурная праграма. Маладыя людзі змогуць азнаёміцца са славутымі мясцінамі, храмамі, замкамі, радавымі сядзібамі, музеямі, гістарычным і сучасным Мінскам, акунуцца ў святочную атмасферу Дня Незалежнасці ў сталіцы, наведаць фестываль вырабаў майстроў народных промыслаў.

«Летняя школа» ўжо стала візітнай карткай БДПУ. Ідэя праекта належыць рэктарам БДПУ і Армянскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта — Аляксандру Жуку і Рубену Мірзаханяну. У 2015 годзе ў межах дагавора аб супрацоўніцтве 20 студэнтаў Армянскага педагагічнага ўніверсітэта прынялі ўдзел у першым праекце «Летняй школы». У 2016 годзе геаграфія ўдзельнікаў пашырылася і ўжо 30 студэнтаў з універсітэтаў Рэспублікі Арменія, Народнай Рэспублікі Бангладэш, Расійскай Федэрацыі і Чэшскай рэспублікі правялі ў Беларусі дзесяць незабыўных дзён.

Пры падтрымцы двух рэктараў у 2017 годзе «Летняя школа» была прадстаўлена на конкурс праектаў па развіцці вышэйшай адукацыі і міжнароднай дзейнасці ўніверсітэтаў Расіі і СНД, дзе стала пераможцай у намінацыі «Асабісты ўклад». Арганізатар конкурсу (Асацыяцыя ўсходнееўрапейскіх універсітэтаў) адзначыў намаганні БДПУ па развіцці міжкультурнай прасторы вышэйшай адукацыі.

Праект рэалізуецца пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, а таксама інфармацыйна-турысцкага цэнтра «Мінск».

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■